# АРЫЕНТАВАЦЦА НА ПАВЫШЭННЕ ЯКАСЦІ

**14 снежня 2018 года ў абласной бібліятэцы імя У.І.Леніна адбыўся справаздачны сход Магілёўскага абласнога аддзялення ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі».**



На сходзе былі падведзены вынікі работы аддзялення за 2018 год, агучаны дасягненні і вызначаны асноўныя напрамкі далейшага развіцця.

У 2018 годзе аддзяленне папоўнілася пяццю пісьменнікамі – і колькасць яго членаў узрасла да 38 чалавек. «Вельмі значна, што да нас імкнуцца маладыя таленты Магілёўскага краю», – падкрэсліў падчас выступлення старшыня абласнога аддзялення пісьменнікаў Алесь Казека.

За 2018 год выдадзена пятнаццаць аўтарскіх кніг і калектыўных зборнікаў. Ва ўстановах адукацыі і ў працоўных калектывах праведзена больш за 700 сустрэч з чытачамі. На старонках рэспубліканскіх, абласных і раённых сродкаў масавай інфармацыі надрукавана звыш 500 публікацый нашых пісьменнікаў.

Вынікам цеснага супрацоўніцтва з абласной грамадска-палітычнай газетай «Магілёўскія ведамасці» з'яўляецца штомесячная літаратурная старонка «Натхненне».

У аддзяленні рэалізуюцца шматлікія творчыя праекты. Адзін з такіх праектаў – літаратурная гасцёўня «Магія слова». Тут з дапамогай сябра Магілёўскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, кандыдата філалагічных навук Алены Кісель, ёсць магчымасць прыадкрыць чароўную завесу таемстваў творчай літаратурнай майстэрні.

Набіраюць папулярнасць літаратурныя марафоны.

«За два апошнія гады нам атрымалася наладзіць работу аддзялення, вызначыць асноўныя накірункі гэтай работы, напрамкі развіцця, – працягвае старшыня абласнога аддзялення пісьменнікаў. – Усё мацней гучыць голас Магілёўскіх пісьменнікаў як у горадзе і вобласці, так і ўва ўсёй нашай любай Беларусі і за яе межамі. І мы ўжо на сваіх сходах узнімаем не толькі праблемы, але і ўсё смялей заяўляем пра свае поспехі, пра свае дасягненні. У будучым годзе асноўную ўвагу неабходна звярнуць не столькі на колькасны паказчык нашай працы, колькі на якасны, каб годна прадстаўляць аддзяленне на мясцовым, рэспубліканскім і міжнародным узроўнях, каб уплываць на літаратурны працэс у вобласці. Неабходна змагацца за павышэнне якасці літаратуры, адшукваць і выхоўваць новыя таленты, гадаваць годную змену нашаму пакаленню літаратараў Магілёўшчыны».

## ЛІТАРАТУРНЫ КАЛЯНДАР:

**4 студзеня** 150 год з дня нараджэння Ядвігін Ш. (Антона Іванавіча Лявіцкага) (4.01.1869 – 24.02.1922). Нарадзіўся ў маёнтку Добасна Кіраўскага раёна Магілёўскай вобласці. Беларускі празаік, публіцыст,фельетаніст, драматург, паэт, перакладчык, літаратуразнавец, палітык, адзін з пачынальнікаў беларускай мастацкай прозы.

**12 студзеня** 100 год з дня нараджэння Васіля Хомчанкі (12.01.1919 – 4.11.1992). Беларускі пісьменнік нарадзіўся ў вёсцы Канічы Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці. Аўтар сцэнарыяў мастацкага фільма «Ветразі майго дзяцінства» (пастаўлены ў 1982 г.) і тэлевізійнага – «Незнаёмая песня» (пастаўлены ў 1983 г.). Пераклаў на беларускую мову казку Р. Кіплінга «Чаму ў слоніка доўгі нос» (1974 г.), апавяданні латышскіх і літоўскіх пісьменнікаў. Узнагароджаны двума ордэнамі Айчыннай вайны II ступені і медалямі.



**ВІНШУЕМ З ДНЁМ НАРАДЖЭННЯ:**

***1 студзеня – ЛЕЎЧАНКУ Мікалая Уладзіміравіча.***
***4 студзеня – ХОБАТАВА Мікалая Паўлавіча.***
***17 студзеня – БЕЛАНОЖКА Алёну Міхайлаўну.***
***18 студзеня – УСЦІНАВУ Жану Віктараўну.***
***31студзеня – СЯЗЁМІНА Дзмітрыя Юр'евіча.***

# ДАВЕР І АДКАЗНАСЦЬ



21 снежня 2018 года на выбарча-справаздачным сходзе літаратурнага аб'яднання «Ветэран» г.Магілёва старшынёй абрана **МАЛЫШАВА Вольга Дзмітрыеўна.**

Вольга Дзмітрыеўна нарадзілася ў г.Растове-на-Доне. Скончыла матэматычны і эканамічны факультэты Калінінскага (Цвярскога) дзяржуніверсітэта. З 1983 года выкладала ў Магілёўскім універсітэце харчавання вышэйшую матэматыку і эканамічныя дысцыпліны. Член Расійскага союза пісьменнікаў. Лаўрэат міжнародных літаратурных конкурсаў. Аўтар двух паэтычных зборнікаў.

## ПУСКАЙ ВЕСНОЙ НЕ ВЫПАДАЕТ СНЕГ

*Мне все-таки важна определенность*
*В погоде, в отношениях, в любви,*
*Когда зимою снег, весною – солнце*
*И с юга прилетают журавли.*

*Мне нравится, когда всё напрямую,*
*Когда не моют кости за спиной.*
*Я не люблю себя, когда ревную,*
*Хотя причины вовсе никакой.*

*Я так ценю доверие и верность,*
*Могу ошибки многие понять.*
*Предательства и хамства – не приемлю,*
*Измены не смогла бы я принять.*

*От жизни мне совсем немного надо:*
*Пускай весной не выпадает снег,*
*И пусть всегда со мною будут рядом*
*Мои друзья и близкий человек.*

## УМИРАЮТ ДЕРЕВНИ

*Умирают деревни, забитые окна,*
*И дома, как слепые у церкви, стоят.*
*В огороде крапива, полынь и осока,*
*И усыпан плодами заброшенный сад.*

*Умирают деревни, страдая от боли,*
*Не играют здесь свадеб, затих*
*детский смех,*
*Лишь тоскует колодец, как птица*
*в неволе,*
*Пересохший он пуст, а был нужным*
*для всех.*

*Умирают деревни, как старые люди,*
*Никого не ругая, судьбу не кляня.*
*Но они будут жить, если их не забудут*
*Непутевые дочери и сыновья.*

# «ПРЫЗНАНЫ ЛЕТАПІСЕЦ БЫХАЎШЧЫНЫ»

**Віншуем з 65-годдзем, шаноўны Мікалай Уладзіміравіч!**



Нарадзіўся Мікалай Уладзіміравіч Леўчанка 1 студзеня 1954 года ў вёсцы Калодзецкая Касцюковіцкага раёна. Скончыў факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта і Мінскую вышэйшую партыйную школу. Працаваў журналістам на радыё, у газетах. Амаль 25 год кіраваў рэдакцыяй Быхаўскай раённай газеты «Маяк Прыдняпроўя». Член Саюза пісьменнікаў Беларусі. Заслужаны журналіст і лаўрэат прэміі «Залатое пяро» Беларускага саюза журналістаў, уладальнік Гран-пры VI Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ. Аўтар сямі кніг паэзіі, прозы, дакументальна-мастацкай публіцыстыкі. Ганаровы грамадзянін Быхаўскага раёна.

## ЛЁС

Ніколі лёс мяне не песціў,
Але заўсёды па жыцці
Імкнуся я з вясёлай песняй
Праз плынь будзённасці ісці.
Мой спеў ляціць, як лебедзь белы,
І адганяе прэч бяду.
Знікае ўсё, што набалела,
Бы камень, кінуты ў ваду.
І хоць на сэрцы зноў прадвесне,
Яно падказвае: узваж,
Ці не пакіне часам песня
Пакуль не поўны твой багаж.

## РОДНАМУ КРАЮ

Я заўсёды сардэчна вітаю,
Адчуваю дыханне вякоў
І ўсяго Прыдняпроўскага краю,
Калі бачу сваіх землякоў.
Родны горад любоўю спавіты,
Роўных вуліц суцішаны строй,
Кожны тут чалавек знакаміты
Нам стварае душэўны настрой.
На заводзе, на ферме ці ў полі,
У любую заўважыш пару:
Не сядзяць там без справы ніколі,
Не хаваюць мазолістых рук.
А працуюць увішна, з імпэтам,
Ёсць здабыткі прыкметныя, плён.
У газетах напішуць пра гэта,
Дзякуй скажуць, ды нізкі паклон.
Услаўляць, каб не стрэлі больш ліха
На шляху самых добрых надзей,
Прыдняпроўе і любы наш Быхаў –
Горад шчырых, руплівых людзей.

# «МІЛЬЁН ЗА ЎСМЕШКУ»



**ПАДАБЕД Мікалай Іванавіч**

Сёння Мікалай Іванавіч Падабед – заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь, заслужаны журналіст Беларускага саюза журналістаў, член Саюза пісьменнікаў Беларусі, лаўрэат рэспубліканскага літаратурнага конкурсу ў намінацыі «Сатыра і гумар». З'яўляецца аўтарам сатырычна-гумарыстычных кніг «Мазалі мядовага месяца», «Мільён за ўсмешку» і «Жонка напракат». У 2018 годзе выйшаў новы зборнік «Сонца сярод ночы», у які ўвайшлі апавесці і апавяданні, якія прымусяць чытача ўсміхнуцца і навучаць вас адшукваць нешта пацешнае нават у самых простых бытавых здарэннях.

## КОСТКА Ў ГОРЛЕ

– Ах, якая ты, Насця, шалапутная! Ахмурыла майго сына, а цяпер круціш з другімі, а яму пудрыш мазгі! – лементавала Соф'я Піліпаўна. – Ой, дурань Сцёпка, што цацкаецца з табою. За каршэнь ды за дзверы! А ты, сыночак, думаеш, што яна ўключыць мазгі? Дудкі! Гарбатага толькі магіла выпраміць. Таму няхай валіць адсюль па дабру. Свет на ёй клінам не сышоўся. Удаўцом не застанешся. Знойдзеш і маладзейшую, і прыгажэйшую. Вунь дзевак, як гразі!

У Насці ад пачутага аж вочы палезлі на лоб, перахапіла дыханне, а слёзы цяклі ручаём… Яна абхапіла галаву рукамі і куляй вылецела з хаты.

– Сціхні, мама! Ну што за чуш нясеш? Як не сорамна? Пакінь яе ў пакоі, – заступіўся Сцяпан за жонку. – Адкуль узяла, што Насця распусніца? На свае вочы бачыла?

– Авоечкі, авой! Во ахламон! – не ўнімалася тая. – Няўжо аглух?! Ці ў вушах коркі завяліся? З яе выкрунтасаў уся вёска смяецца. А табе па барабану.

– Мама, пабойся Бога! Усё гэта чуткі, байкі, плёткі… А ты верыш ім. Лепш паглядзі, хто напявае на вуха: адна ў разводзе, у другой зусім з замужжам не склалася, трэцяя – маладая ўдава… Таму і кідаюцца яны на мужыкоў, як галодныя ваўкі на касуль. Хацелі ахамутаць і мяне – не ўдалося. А цяпер выдумляваюць усялякія небыліцы пра Насцю… Яны гатовы на любое паскудства, каб толькі абліць яе граззю з ног да галавы.

Жанчына адразу паспакайнела, ацiхла. Але ненадоўга. Зноў узялася за сваё:

– Ой, сыночак, уліп з гэтай жаніцьбай, дык уліп. Абвяла Насця цябе вакол пальца. Эх, цямця-лямця! Напруж мазгі! Яна табе не пара. Ты хлопец статны, высокі, спакойны, да чаркі не прыкладваешся, а Насця – кату пад хвост. І з твару нягеглая: ні самому паглядзець, ні людзям паказаць. Не носу нават бусел пазайздросціць. А яшчэ – вярціхвостка! Вось хто яна такая! Будзеш усё жыццё біцца як рыба аб лёд, каб пракарміць чужых дзетак-«крапіўнікаў».

– Няпраўда! – успыхнуў Сцяпан. – Мне мазгі не калупай і не плюй у душу! Насця не такая. Яна добрая, ласкавая, пяшчотная, клапатлівая, працавітая… А ты абняславіць хочаш. Засячы на носе – я яе ў крыўду не аддам!

– Ах, вось які ты?! Не чакала такога ад цябе! Маці на шалахвостку памяняў! Каб вашага духу тут не было! Вымятайцеся! А то ў міліцыю пазваню!

– А навошта смяшыць людзей? Калі не ўзлюбіла жонку, мы доўга не затрымаемся. Бо яна для цябе, як костка ў горле. Заўтра з'едзім, хоць на край свету. Каб толькі не чуць і не бачыць гэтых «канцэртаў»…

…Лічаныя гадзіны заставаліся да Новага году. Сцёпка, вярнуўшыся з працы, стаў упрыгожваць ёлку. Насця завіхалася на кухні – гатавала прысмакі да святочнага стала. Раптам раздаўся званок. Сцяпан паспяшаўся да дзвярэй. Калі адчыніў іх – вачам не паверыў: ля парога стаяла маці з клункамі ў руках.

– Прымай госця, – ціха прамовіла яна і вінавата апусціла галаву. – Калі не рад, завярну аглоблі назад. Сыночак, чаго глядзіш на мяне, як падатковы інспектар на даўжніка? Няўжо крыўду затаіў? А дзе ж Насця? Я вось прыехала, каб пакаяцца, ачысціць душу ад грахоў. Не ведаю, ці зможаце вы мне дараваць, што тады лішняга нагаварыла – выкурыла вас з хаты, але я пастараюся ў новым годзе замаліць, загладзіць сваю віну. Хочаце стану на калені? Толькі пашкадуйце мяне – даруйце… Не магу жыць без вас. Калі не супраць – вяртайцеся назад.

Соф'я Піліпаўна не магла стрымаць слёз – заплакала, уткнуўшыся тварам у сынавы грудзі. Сцёпка абняў маці, прытуліў да сябе і не ведаў, якія словы знайсці, каб суцешыць яе.